Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. СЕРАДА № 196 (27311) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Далёка не ўсе маладыя сем'і сёння ведаюць аб тым, якую матэрыяльную дапамогу ад дзяржавы яны маюць права атрымліваць пры нараджэнні дзяцей. «Звязда» прапануе вам падрабязны агляд асноўных відаў дапамогі.** СТАР 4



**«Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна запрасіў беларускіх мастакоў увасобіць сельскія пейзажы і вяскоўцаў на сваіх палотнах, каб потым адкрыць уласную карцінную галерэю.** СТАР 5

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ, прафесар, доктар біялагічных навук, дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі:**

***«Беларуская генетыка канкурэнтаздольная на сусветным рынку. У Беларусі праводзяцца сур'ёзныя даследаванні ў галіне навуковай генетыкі. Большасць даследаванняў ажыццяўляецца на малекулярным узроўні. Распрацоўкі Інстытута генетыкі і цыталогіі дапамагаюць селекцыянерам, а таксама выкарыстоўваюцца для больш эфектыўнай падрыхтоўкі спартсменаў, выяўлення схільнасці да розных захворванняў і г.д.».***

*(На міжнародным навуковым форуме «Генетыка і біятэхналогія XXI стагоддзя: праблемы, дасягненні, перспектывы» ў Мінску.)*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +11° |
| Віцебск | +8° |
| Гомель | +10° |
| Гродна | +9° |
| Магілёў | +8° |
| Мінск | +8° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 ▲ |
| Еўра | 11170,00 ▲ |
| Рас. руб. | 277,50 ▲ |
| Укр. грыўня | 1062,64 ▲ |

ISSN 1990 - 763X



# ПАЎНОЧНЫ ВІНАГРАД

**У жыхароў Мёраў Георгія і Фаіны ШОКЕЛЯЎ прысядзібны ўчастак не большы і не меншы, чым у суседзяў — роўна шэсць сотак. Калі ж «адмінусаваць» ад іх частку, адведзеную пад дом і гаспадарчыя пабудовы, зямлі набярэцца не болей за чатыры соткі. Але здзіўляе не колькасць плошчы і нават не тое, што ўся яна адведзена пад вінаград, а што гаспадары маюць у сваёй садова-агароднай калекцыі каля 50 гатункаў гэтай цеплалюбівай расліны. І, нягледзячы на паўночны рэгіён, лаза шчодра адорвае сваіх руплівых гаспадароў. З кожнага куста яны здымаюць па дзясятку і болей кіло налітага сонечным сокам вінаграду. У той час, калі на паўднёвых прамысловых плантацыях з куста бяруць усяго ад 5 да 10 кілаграмаў. Значыць, падыход да справы ў Шокеляў выйшаў, можна сказаць, на сапраўдны прафесійна-прамысловы ўзровень?**

— Не, гэта наша сямейнае захапленне, наша агульнае з Фаінай хобі, — кажа Георгій Якаўлевіч. — Хто хоць аднойчы паспрабаваў заняцца вінаграднай лазой і атрымаў вынікі ў выглядзе сакавітых гронак, ужо ніколі не пакіне гэтае захапленне.

Былы вадзіцель рэйсавага аўтобуса па дарогах Віцебшчыны некалі пачынаў акультурваць свой агарод звычайнымі пладовымі дрэвамі, пазней захапіўся больш экзатычнымі — алычой і персікам. А як падышоў час пенсіі, не на жарт захварэў на вінаград. Пачынаў з самага «народнага» ў Беларусі гатунку — «Ізабэлы». Далей — болей. Сваімі сталі на гэтым паўночным агародзе «Цімур», «Агат Данскі», «Нэра», «Вікторыя», «Супага», «Ліепайскі бурштын», «Доўга», «Ірынка», кіш-міш «Міраж»... Адзін прыгажэй за другі, саладзей, смачней... Георгій і Фаіна могуць на смак вызначыць гатунак, не кажучы пра знешні выгляд.

— Я выпрабоўваў розныя гатункі, у тым ліку і беларускія, але прыйшоў да высновы, што для нашага клімату найлепей падыходзіць вінаград прыбалтыйскіх селекцый, — кажа Георгій Якаўлевіч. — За дваццаць гадоў набыў такі-сякі вопыт, і цяпер мне нескладана ўпраўляцца на сваёй хатняй плантацыі. Шмат ведаў пераняў у клубе «Паўночны вінаград», багата інфармацыі атрымаў на выстаўках. Але ўласную школу працы нічога не заменіць...

Акрамя вінаграду, у Георгія і Фаіны Шокеляў ёсць яшчэ два даўнія захапленні, пра якія ведаюць многія іх землякі і знаёмыя. Па-першае, яны апантаны развядзеннем садовай маліны, маюць невялікі гадавальнік за горадам. Маліна дае ім штогод па два ўраджаі. А яшчэ шмат гадоў сябруюць з намі, бо з'яўляюцца сталымі падпісчыкамі «Звязды». Дзякуючы гэтаму адкрыццю яшчэ раз пераканаўся, якія ўсё ж незвычайныя нашы чытачы!

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў МТРК «Мір» з дваццацігоддзем тэлеканала

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» з дваццацігоддзем тэлеканала.**

«За мінулыя гады ваш калектыў заваяваў аўтарытэт у глядацкай аўдыторыі дзяржаў Садружнасці і пераканаўча даказаў, што ён можа канкурыраваць як роўны з вядучымі тэлевізійнымі арганізацыямі свету», — гаворыцца ў віншаванні.

«Створаныя вамі тэлеперадачы вызначаюцца асаблівым стылем, дынамізмам, накіраванасцю на збліжэнне нашых народаў пры асвятленні палітычнага, эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што тэлеканал «Мір» і ў далейшым будзе займаць лідзіруючыя пазіцыі ў фарміраванні агульнай інфармацыйнай прасторы краін Садружнасці, павышаць узровень прывабнасці сваіх праграм і радаваць новымі яркімі праектамі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Надзённае

## ЖЫХАРЫ КААПЕРАТЫВАЎ ЗІМОЙ НЕ ЗМЕРЗНУЦЬ

**Дырэктар гомельскай кіруючай кампаніі «Жыллёвыя сістэмы будынкаў» Дзмітрый Таранаў жыллёва-камунальную гаспадарку ведае добра. Прыйшлося папрацаваць у яе дзяржаўным сектары, а вось цяпер ён узначальвае прыватнае прадпрыемства па аказанні паслуг жыхарам шматкватэрных дамоў. Іх колькасць павялічваецца паступова. Сёння на абслугоўванні арганізацыі ўжо знаходзіцца 18 будынкаў так званых «кааператыўных» дамоў. Гэта як палова звычайнага жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка. Да зімы, як і ў дзяржаўным сектары, пачалі рыхтавацца загадзя.**

— Ёсць дакладныя правілы, і яны агульныя для ўсіх арганізацый. Ёсць кантралюючыя арганізацыі, якія ажыццяўляюць нагляд за нашай дзейнасцю. Мы знаходзімся ў адным юрыдычным полі і датуемся аднолькава, па адных і тых жа законах. Пачалі падрыхтоўку да зімы яшчэ ў чэрвені. Па-першае, гэта хаджэнне па розных інстанцыях, збор дакументаў. А рэальная рэвізія сістэмы ацяплення і сантэхнікі адбываецца восенню. Месяц-паўтара патрабуюць на гэтыя работы. У верасні-кастрычніку мы заўсёды імкнёмся вызваліць сантэхнікаў ад іншых нагрузак, каб даць час на падрыхтоўку да зімы. Зразумела, усё залежыць ад фінансавання. Работы ў межах падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона выконваюцца за кошт грошай на тэхнічнае абслугоўванне, па-першае. І па-другое, пакрыццё страт адбываецца з гарадскога бюджэту ў межах даведзенага нарматыву. Працэдура аднолькавая што ў дзяржаўным, што ў прыватным сектары. Нам вельмі дапамагаюць інспектары «Энерганагляду». Але ж калі ў ЖЭУ яны глядзяць дамы выбарачна, даюць загады, а потым правяраюць іх выкананне, то ў жыллёва-будаўнічых кааператывах інспектары з'яўляліся літаральна ў кожным доме. І сёлета па кожным былі заўвагі і прадпісанні, якія мы выконвалі. СТАР. 3

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уга Чавеса з перамогай на выбарах

**Позна вечарам 8 кастрычніка адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з Прэзідэнтам Венесуэлы, падчас якой Аляксандр Лукашэнка павіншаваў свайго калегу з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах.**

«Я прысвячаю гэту перамогу табе і нашаму беларускаму народу», — так адказаў Уга Чавес на віншаванні свайго сябра Аляксандра Лукашэнкі.

Прэзідэнт Венесуэлы выказаў словы вялікай удзячнасці Прэзідэнту Беларусі і ўсяму беларускаму народу за неацэнную дапамогу ў сацыяльна-эканамічным развіцці Венесуэлы, будаўніцтве буйных прадпрыемстваў і інфраструктуры, пастаянную палітычную падтрымку.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся ў бліжэйшы час сустрэцца і намеціць сумесны парадак дня далейшых двухбаковых дзеянняў у розных сферах супрацоўніцтва.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПЯТАГА СКЛІКАННЯ**

**19 кастрычніка 2012 года ў 11.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) пачне работу першая **сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання**. **Рэгістрацыя членаў Савета Рэспублікі адбудзецца 19 кастрычніка з 9.00 да 10.20.**

## ПАВЕЛІЧЭННЕ ТАРЫФАЎ НА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ ЗРОБІЦЬ «РАЗУМНЫЯ ЛІЧЫЛЬНІКІ» БОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫМІ?

**«Разумныя электралічыльнікі» ўстанаўліваюцца ў Беларусі з 2009 года. Але пакуль іх у сваіх дамах усталявалі толькі 10% насельніцтва.**

Сучасныя шматтарыфныя прыборы ўліку электраэнергіі даюць магчымасць плаціць па розных тарыфах у залежнасці ад часу сутак. З 22:00 да 17:00, а таксама ў выхадныя і святочныя дні прымяняецца мінімальны тарыф, з 17:00 да 22:00 — максімальны.

Эканомныя еўрапейцы заняліся ўстаноўкай новых лічыльнікаў гадоў дзесяць таму. Пасля гэтага многія перагледзелі свае бытавыя звычкі і перанеслі частку хатніх спраў з пікавага на больш спакойны і танны час. У выніку, напрыклад, у Італіі, дзе адбылося самае маштабнае ўкараненне такіх прыбораў уліку, штомесячная плата за электраэнергію скарацілася амаль у два разы. Сярод іншых плюсоў укаранення «разумных электралічыльнікаў» — скарачэнне пераболаў у рабоце сеткі і звязаных з імі выдаткаў.

**Каштуюць шматтарыфныя прыборы ўліку электраэнергіі прыкладна 400-450 тысяч рублёў.**

Многія беларусы са скепсісам ставяцца да новых ініцыятыў — асабліва калі тыя звязаны з немалымі грашовымі ўкладаннямі. Але энергетыкі чакаюць павелічэння папулярнасці шматтарыфных лічыльнікаў, калі будзе эканамічны стымул, такі як, напрыклад, павелічэнне тарыфаў.

Спажыўцоў, якія карыстаюцца «разумнымі лічыльнікамі», увод дыферэнцаваных тарыфаў на электраэнергію не закране. «Мяркуецца, што дыферэнцаваныя тарыфы не будуць прымяняцца да гэтых грамадзян, што таксама можа стаць стымулюючай мерай для іншых», — заяўляюць у «Белэнерга».

**Святлана БУСЬКО.**

## На рабочага ўпаў груз

**Здарэнне адбылося ўздзень у сталіцы па вуліцы Сурганава — на будоўлі шматкватэрнага 19-павярховага жылога дома.**

Вежавы кран падымаў арматурныя каркасы ў колькасці 8 штук з пляцоўкі складзіравання на адзнаку 19 паверха. На ўзроўні 8 паверха 4 каркасы абрынуліся ўніз. У выніку пацярпеў цясляр-бетоншчык таварыства з абмежаванай адказнасцю — прадпрыемства-падрадчыка. Пацярпелага з рознымі траўмамі шпіталізавалі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Плантацыя канопляў ля мяжы

**Памежнікі і міліцыянеры затрымалі трох маладых жыхароў Верхнядзвінскага раёна, якія вырашылі далучыцца да наркабізнэсу.**

Калі палацкім памежнікам і супрацоўнікам міліцыі Верхнядзвінскага раёна стала вядома аб існаванні каля ракі Заходняя Дзвіна канаплянай плантацыі, яны прынялі рашэнне выкарыстаць апошнюю ў якасці «жыўца». І чакаць доўга не давялося. У выніку быў затрыманы аўтамабіль «Рэно», у якім знаходзіліся тры мясцовыя жыхары, аднаму з якіх 17 гадоў, а яшчэ двум па 22. У машыне праваахоўнікі знайшлі больш за 70 кілаграмаў свежаскошаных канопляў. Распачаты следчыя мерапрыемствы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# З БЕЛАРУСІ ЛАС-ВЕГАС РАБІЦЬ НЕ БУДУЦЬ

**Думаю, вам вядома, што ў Расійскай Федэрацыі забаранілі дзейнасць ігральнага бізнэсу. Беларусь пайшла іншым шляхам: бізнэс пакінула, але пад жорсткім кантролем. Зусім нядаўна пачаў дзейнічаць Указ Прэзідэнта № 416, які значна змяніў рэгуляванне гэтай сферы. Створана і пачала дзейнічаць Асацыяцыя развіцця ігральнага бізнэсу, членамі якой ужо сталі больш за 30 юрыдычных асоб ігральнай індустрыі. Самы час пагутарыць аб развіцці гэтай няпростай сферы ці то эканомікі, ці то турызму.**



Фота Пятра ФАМІНА.

## Гуляйце. Толькі па законе

**Уладзімір МУКВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю падакцызных тавараў, ігральнага бізнэсу і электронных сістэм кантролю рэалізацыі тавараў Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь** агучыў дзяржаўную пазіцыю ў дачыненні да ігральнага бізнэсу так: «Вырашана, што ў Беларусі гэтаму бізнэсу быць. Але была пастаўлена задача: неабходна стварыць такія ўмовы, каб, з аднаго боку, гэта сфера прыносіла даходы дзяржаве, а з іншага, каб усё было празрыста». Зразумела, што асобныя краіны падтрымліваюць гэты бізнэс, іншыя — абмяжоўваюць. Некаторыя ўвогуле забараняюць. «Мы маглі, вядома, пайсці па шляху Расіі і забараніць, але гэта не зусім правільна, — лічыць прадстаўнік міністэрства. — Гэта не дало б нам магчымасці скарыстацца спрыяльнымі ўмовамі, каб у нашу краіну ездзіла больш турыстаў. Тым больш, калі забараніць, ігральны бізнэс не знікне. Як правіла, ён проста пераходзіць у «цень», не плаціць падаткі, парушае правы тых, хто гуляе, і гэтак далей». Дарэчы, у нас пакуль забаронены азартныя гульні праз інтэрнэт. «Але неабходна легалізаваць і гэта. Бо той, хто захоча, згуляе і нелегальна. Трэба ж абараніць таго гульца», — упэўнены Уладзімір Муквіч. Акрамя таго, на яго думку, развіццё ігральнага бізнэсу ў Беларусі — не азначае, што ў рэспубліцы павінна з'явіцца шмат ігральных устаноў. «Вопыт ігральнага бізнэсу ў Беларусі непрацяглы. А таму трэба яшчэ шмат чаго дапрацаваць. Вось у гэтым і будзе развіццё. Раней гэту сферу кантралявала Міністэрства спорту і турызму. З 1 студзеня 2011 года гэтым займаецца Міністэрства па падатках і зборах. За паўтара года зроблена шмат, асабліва ў сферы заканадаўства. І мы надалей будзем стрымліваць і абмяжоўваць гэты бізнэс. Таму Беларусь не стане падобнай да Лас-Вегаса. Мы такой задачы не ставім. Тым больш што ігральны бізнэс — спецыфічная дзейнасць, яна звязана з шэрагам негатыўных момантаў, таму гэтага не павінна быць у крокавай дасягальнасці». Усе мы бачым (асабліва жыхары сталіцы), што ігральных устаноў даволі шмат, і якраз у гэтай самай «крокавай дасягальнасці». Уладзімір Муквіч абвяргае гэта лічбамі: «Не так шмат у нас ігральных устаноў. Вось вам некаторыя факты. У нас зараз ёсць 116 ліцэнзіятаў у ігральным бізнэсе. На 1 студзеня 2011 года іх было 205. Тое самае адбываецца з ігральнымі ўстановамі. На 1 студзеня 2011 года іх было 648. На 1 верасня 2012 года — 406. Цяпер канкурэнцыя становіцца больш жорсткай. А таму яны карыстаюцца ўсімі сродкамі, каб сябе прарэкламаваць. Вось і здаецца, што іх больш стала». Пры гэтым, паводле слоў спецыяліста, нягледзячы на тое, што колькасць ліцэнзіятаў скарачаецца, паступленні ў бюджэт з гэтай сферы павялічваюцца: «За 2010 год у бюджэт сабралі каля 70 млрд рублёў, за 2011 — 108,2 млрд, за 8 месяцаў 2012 года — ужо 153,3 млрд». Такія паказчыкі забяспечваюцца нашай сістэмай падаткаабкладання: існуе фіксаваная стаўка. Таму ўсё залежыць ад колькасці ігральнага абсталявання, якое выкарыстоўваецца. «Гэта не самая справядлівая сістэма і не залежыць ад таго, якія даходы атрымлівае арганізатар азартных гульняў. Затое тут складаней схаваць свае даходы. Але гэта сістэма будзе ўдасканальвацца, і падаткаабкладанне стане камбінаваным. Мы збіраемся стварыць спецыяльную камп'ютарна-касавую сістэму, якая будзе забяспечваць кантроль за абаротамі ў сферы ігральнага бізнэсу. Доследная версія такой сістэмы ўжо апрабоўваецца».

## Новая галіна эканомікі?

**Юрый ЧАБАТАР, сустаршыня Асацыяцыі развіцця ігральнага бізнэсу,** увогуле лічыць, што галоўная задача Асацыяцыі — у садзейнічанні цывілізаванаму развіццю ігральнага бізнэсу, а ў перспектыве станаўленню новай галіны айчыннай эканомікі. Не ведаю, як вас, а мяне гэта трошкі пужае. Дадатковыя грошы ў бюджэт — гэта, безумоўна, добра. Але якімі ахвярамі? Зразумела, што ігральны бізнэс — у першую чаргу бізнэс. Як быццам нічога дрэннага няма. Асацыяцыя нават хоча распрацаваць правілы прафесійнай этыкі: «Гэта будзе своеасаблівы «кодэкс гонару» ўдзельнікаў Асацыяцыі. Мы будзем падтрымліваць толькі сумленных удзельнікаў». Прыводзяць таксама такія аргументы: «Развіццё ігральнага турызму дазваляе павялічваць даход сумежных сфераў — гасцінічнага бізнэсу, гандлю, грамадскага харчавання і гэтак далей. Мы ўпэўнены, што развіццё забаўляльнай сферы дазваляе павялічваць даходы дзяржавы і ствараць новыя працоўныя месцы». Тыя, хто займаецца ігральным бізнэсам, нават кажуць, што добра разумеюць адказнасць перад грамадствам і гатовы актыўна (у межах сваіх магчымасцяў) удзельнічаць у сацыяльных праектах. «І гэта не разавыя дабрачынныя акцыі, а планамерная праца, — сцвярджае Юрый Чабатар. — Напрыклад, мы плануем браць удзел у лёсе адораных дзяцей з дзіцячых дамоў і малазабяспечаных сем'яў». А як жа быць з тым, што ёсць людзі, чыё жыццё ламаецца з-за залежнасці ад гульні? «Ва Указе Прэзідэнта № 416 добра прапісаны механізм самаабмежавання ад гульні, — тлумачыць прадстаўнік Асацыяцыі развіцця ігральнага бізнэсу. — Чалавек, які разумее, што мае гульнявую залежнасць, можа прыйсці ў любую ігральную ўстанову і напісаць заяву аб тым, каб яго не пускалі гуляць, — аўтаматычна гэта інфармацыя будзе вядома ва ўсіх ігральных установах Беларусі. Такі чалавек не зможа наведаць ніводнай такой установы». Аднак пры гэтым сваякі падобнага чалавека гэтага зрабіць не змогуць. Тлумачаць гэта тым, што чалавек жа можа і не прыносіць ніякіх непрыемнасцяў сваёй сям'і такім хобі, але сваякам трэба проста не падабаецца — тут ужо парушэнне яго асабістых правоў. Але, паводле слоў і бізнэсоўцаў, і прадстаўніка Міністэрства па падатках і зборах, гэтыя пытанні яшчэ будуць дапрацоўвацца. Аднак, улічваючы, што сёння наведнікі казіно — гэта напалову беларусы, напалову замежнікі (дарэчы, больш за ўсё да нас прыязджаюць гуляць з Расіі, а таксама з Турцыі і Італіі), мне страшнавата за сваіх суайчыннікаў. І размовы пра дабрачыннасць падобны да куплі індульгенцый у Сярэднявеччы. Увогуле, развагі аб выгадасці для бюджэту і бессэнсоўнасці забароны мне нагадваюць абмеркаванне легалізацыі прастытуцыі, калі многія казалі: «Усё роўна яна будзе, чаго супраціўляцца?» А даходы бюджэту пойдуць пасля на лячэнне тых, хто будзе пакутаваць ад залежнасці. Але гэта выключна маё меркаванне...

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ**

## ШЫНЫ НА МІЛЬЯРД

**Супрацоўнікі УДФР КДК па Магілёўскай вобласці і служба бяспекі ААТ «Белшына» папярэдзілі нелегальны абарот аўтамабільных шын на суму больш за 1 мільярд рублёў.**

У адным з боксаў гаражна-будаўнічага кааператыву ў Бабруйску, які арандаваў індывідуальны прадпрымальнік з Дагестана, былі знойдзены вырабленыя на «Белшыне» аўтамабільныя пакрышкі ў асартыменце, колькасцю болей за 1800 адзінак. Уласнік тавару не прад'явіў дакументаў, якія пацвярджалі б законнасць іх набыцця і захоўвання.

— Даверавая асоба расійскага прадпрымальніка спрабавала прадставіць таварна-транспартную накладную, але яна аказалася несапраўднай, — паведаміў намеснік начальніка УДФР КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр Шаройкін. — Пастановай Гаспадарчага суда аўтамабільныя шыны былі канфіскаваны ў даход дзяржавы, а парушальнік аштрафаваны на 5 мільёнаў рублёў.

Шыны на мільярд рублёў — гэта самая буйная партыя таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў, якія адабраны УДФР з нелегальнага абароту за апошнія 5 гадоў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ТРАПІЛІ ПАД ЦЯГНІК І ВЫЖЫЛІ

**На чыгуначным перагоне Лёзна—Крынкі аўтамабіль «Фальксваген», у якім разам з вадзіцелем знаходзіліся тры чалавекі, выехаў на забаронны сігнал святлафора на чыгуначны пераезд, дзе сутыкнуўся з дызель-цягніком.**

Інцыдэнт адбыўся а 13 гадзіне дня. Навошта вадзіцель паехаў? Тым больш што пераезд абсталяваны спраўнай светлавой і гукавой сігналізацыяй. Наглядзеўся фільмаў пра пагоні? Лакаматыў і аўтамашына атрымалі механічныя пашкоджанні. Затрымкі ў руху цягнікоў не было.

Што дзіўна, кіроўца і пасажыры з месца здарэння ўцяклі. Потым пасажыр аўтамабіля, жыхар вёскі Новае Сяло Лёзненскага раёна, звярнуўся па дапамогу ў бальніцу. Медыкі канстатавалі ў яго закрыты пералом двух рэбраў. Месцазнаходжанне кіроўцы і другога пасажыра ўстанаўліваецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ — АМАЛЬ 2 КГ РТУЦІ

**Удзень у службу МНС звярнуўся брыгадзір электразварачнай брыгады: у падвале аднаго з пад'ездаў жылога дома па сталічнай вуліцы Кедышкі знойдзена ртуць.**

Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, у згаданым пяціпавярховым доме праводзіўся планавы рамонт. Падчас апошняга рабочыя і знайшлі дзве герметычныя шкляныя колбы з ртуццю агульнай вагой больш за 1,7 кілаграма.

У гэты ж дзень увечары ртуць была знойдзена падчас прыборкі гаража ў вёсцы Падлабенне, што на Гродзеншчыне. Метал у колькасці прыблізна 200 грамаў знаходзіўся ў шчыльна закаркаванай шкляной бутэлечцы, якая стаяла ў металічным сейфе ў гаражы пад двухпавярховым цагляным домам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЖЫХАРЫ КААПЕРАТЫВАЎ ЗІМОЙ НЕ ЗМЕРЗНУЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Да прыватніка, атрымліваецца, патрабаванні большыя?**

— Канешне, і істотна! Асноўная праблема — дакументаабарот. Звычайна ён павялічваецца тады, калі памяньшаецца фінансаванне. Менш грошай — больш папер. Бо кожны імкнецца сябе засцерагчы і апраўдаць праблемы. Часам адны і тыя ж паперы накіроўваем у розныя інстанцыі. Прычым і ў тых выпадках, калі не адбылося ніякіх змяненняў, дакументы ўсё роўна трэба аднаўляць. І яшчэ. Атрымліваецца, што ў дзяржаўным домаўпраўленні на 30 дамоў — адзін інспектар, а ў нас на кожны дом ён асобны: электранагляду, цепланагляду.... І з кожным трэба працаваць асобна. Мы выходзілі з прапановай іх неяк аб'яднаць, але ж, здаецца, нам яшчэ не вельмі давяраюць. Кажуць: маўляў, вы сёння ёсць, заўтра вас няма. А жыллёвыя кааператывы зарэгістраваны як розныя юрыдычныя асобы... Не бярэцца да ўвагі тое, што ў іх адна абслуговая арганізацыя, — кажа Дзмітрый Таранаў.

Ёсць і такія пытанні падрыхтоўкі да зімы, якія можа вырашыць толькі кіруючая кампанія. Вельмі важна, напрыклад, загадзя правесці ўцяпленне трубаправода, бо, калі ацяпляльны калектар не ўцеплены, значыць, будзе грэцца падвал, а страты цяпла будуць адбывацца па ўсім доме. На жаль, жыхары далёка не заўсёды зачыняюць дзверы падвалаў. Таксама праводзіцца шкленне вокнаў падвалаў, устаноўка рашотак. Цяпер, калі паўсюдна ўстаноўлены дзверы з дамафонамі, менш цяпла страчваецца праз пад'езды. Энерганагляд заўсёды звяртае ўвагу на правядзенне прафілактычных работ з так званай «запорнай арматурай» — гэта засаўкі, вентылі, якія павінны быць змазаны, каб на працягу зімы не было ўцечак і страт цепланосьбіта. Праводзім і шкленне вакон у пад'ездах.

— У адным з дамоў у нас атрымалася сёлета замяніць часткова вокны — паставілі пластыкавыя па адным у кожным пад'ездзе. У некаторых жыллёва-будаўнічых кааператывах, асабліва ў новых дамах, людзі на сходзе самі выказваюць жаданне сабраць грошы, якія накіроўваюцца для рэалізацыі пэўнай мэты. Напрыклад, за кошт дадатковага збору, выплата якога расцягваецца на год, замяняюць у пад'ездах вокны. У жыхароў кааператыўных дамоў ёсць разуменне, што бясплатна не бывае нічога. Калі хочаш нешта зрабіць лепш, трэба патрацціцца, — лічыць Дзмітрый Таранаў.

**Асноўная праблема — дакументаабарот. Звычайна ён павялічваецца тады, калі памяньшаецца фінансаванне. Менш грошай — больш папер. Бо кожны імкнецца сябе засцерагчы і апраўдаць праблемы.**

Што датычыцца ўстаноўкі рэгулятараў сістэмы ацяплення ў дамах, то за кошт грошай на бягучы рамонт гэта зрабіць не атрымаецца. Патрэбны дадатковы праект за кошт сродкаў капрамонту. Такія прыборы здольныя пры павелічэнні-памяншэнні знешняй тэмпературы паветра рэгуляваць колькасць цепланосьбіта і значна зніжаць страты непасрэдна ў доме.

— Хаця ў нас ёсць папярэдняе цеплрэгуляванне, якое ідзе ад цэнтральнага цеплавога пункта (ён абслугоўвае групу дамоў), аднак у розных будынкаў розныя страты цяпла. Таму было б больш карысна, каб кожны дом рэгуляваўся асобна, у аўтаномным рэжыме. Дарэчы, новыя дамы здаюцца зараз з гэтымі сістэмамі рэгулявання. Пры гэтым мы сутыкнуліся і з сітуацыяй, калі да нас прыходзілі з просьбай узяць на абслугоўванне дамы, у якіх аўтаматыка была ўжо непрыдатнай — з-за таго, што не эксплуатавалася пэўны час. Танней было б падтрымліваць працаздольнасць сістэмы, чым потым яе замяняць. Але ж многія раней лічылі: маўляў, навошта эканоміць — тарыфы на цяпло не такія ўжо і дарагія. Няхай лепш будзе спакотна, а мы вокны падчыняем. Такое меркаванне і сёння ёсць, на жаль.

**— Відаць, сёння многія мараць пра пакватэрнае рэгуляванне цяпла?** — пытаюся ў Таранава.

— У некаторых новых дамах ужо ёсць пакватэрнае рэгуляванне — калі кожны можа ўстанавіць тую тэмпературу, якая асабіста камфортная для яго. Але ж і тут ёсць нюанс, які трэба ўдасканаліць заканадаўча. Калі кватэра не эксплуатуецца пэўны перыяд, яе ўладальнікі цалкам перакрываюць ацяпленне. А гэта вядзе да перацякання цяпла: сама кватэра астуджаецца, і атрымліваецца, што яна абаграваецца за кошт суседзяў. І суседзі вымушаны больш адкрываць вентыль. Дарэчы, у Германіі заканадаўча абмежаваны ніжні ўзровень абагрэву — нават, калі ў кватэры няма нікога, тэмпература не павінна зніжацца ніжэй за 14 градусаў. І ўвогуле, самае галоўнае — паўсюль праводзіць работы планава.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# АСНОЎНАЕ ПАЛІВА — ДРОВЫ

**Што такое ЖКГ для маленькага райцэнтра? Гэта найперш падача вады і цяпла ў дамы і кватэры як гарантыя забеспячэння нармальнай якасці жыцця месцічаў. А цяпло ў кватэрах, як вядома, уплывае не толькі на здароўе, камфорт, але і на штодзённы настрой людзей — дома, на працы, на вуліцы. Пра гэта дырэктар Драгічынскай ЖКГ Аляксандр Макуха гаворыць з веданнем справы, бо ўзначальвае гаспадарку 26 гадоў.**

Аляксандр Андрэевіч успамінае гады, калі запасу мазуту ў кацельнях заставалася фактычна на суткі. Гэта было сапраўдным выпрабаваннем. Добра, што тыя часы даўно мінулі. Паспяхова прайшла газіфікацыя. Газ паступае згодна з графікам і лімітамі. Цяпер падрыхтоўку да зімы ў раёне пачынаюць з пачатку лета.

— З 30 нашых кацельняў 24 працуюць на мясцовым паліве, — гаворыць дырэктар ЖКГ. — Дровамі мы ацяпляем большасць школ, дзіцячых садкоў, медыцынскіх устаноў і ўстаноў культуры. На гэты сезон нарыхтавалі 10,5 тысячы кубаметраў драўніны, што нават крыху больш ад запланаванага. Дровы вывезены, парэзаны, здробнены, складзены ў падсобных памяшканнях з тым, што аператару толькі застанецца ўзяць паліва і закінуць яго ў топку.

Яшчэ Аляксандр Макуха расказаў, што дзве кацельні сёлета перажылі капітальны рамонт, зараз туды нават прыемна зайсці, гэта значыць, аператар будзе працаваць цэлую зіму ў належных умовах. Названыя кацельні — апошнія аб'екты, якія трэба было паднавіць, іншыя рамантаваліся ў папярэднія гады.

Да пачатку ацяпляльнага сезона здадзены ў строй і жылы дом па вуліцы Завадской, у якім вялі капітальны рамонт. Будынак атрымаў цеплавую рэабілітацыю, тэмпература ў кватэрах абяцае быць максімальна камфортнай.

Аляксандр Макуха лічыць, што сёння можна гаварыць аб 100-працэнтнай падрыхтаванасці да зімы, бо ўсе жылыя дамы горада і раёна, якія знаходзяцца на балансе ЖКГ, прайшлі працэдуру агляду камісіяй і атрымалі пашпарты гатоўнасці.

Людзі, якіх набіраюць на перыяд ацяпляльнага сезона, ужо прынятыя на работу. Яны прайшлі неабходнае навучанне і перападрыхтоўку.

Паспяховаму правядзенню сезона павінна паспрыяць і тое, што за лета заменена 3500 метраў цеплавых сетак. На газавых кацельні паліва паступіла ў неабходнай колькасці. Застаецца сачыць за тэмпературай паветра. Калі сярэдняя апусціцца да 10 градусаў цяпла, у Драгічыне пачнуць падключаць садкі, школы, бальніцы. А пры +8 пацяпле ў жылых памяшканнях.

Гатовы ў палескім райцэнтры і да такіх непазбежных з'яў, як снег і галалёд. Падрыхтавана тэхніка, назапашана тысяча тон пясчанай сумесі для падсыпкі дарог.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Пятра ФАМІНА.

# ЗБЕРАГЧЫ ЦЯПЛО Ў КВАТЭРЫ

## ПАД СІЛУ КОЖНАМУ. ГАЛОЎНАЕ — РАБІЦЬ ГЭТА ЗАКОННА

**Хутка распачнецца ацяпляльны сезон. А разам з ім паўстане і адвечная праблема — як зрабіць так, каб у кватэры было цёпла, нягледзячы на мінусавую тэмпературу? І калі ў прыватным доме чалавек сам сабе гаспадар, то ў шматпавярховым сітуацыя рэзка мяняецца. Халодныя пад'езды, незаконныя ўрэзкі ў сістэму ацяплення ці трапічная тэмпература ў кватэры пасярод зімы адбіваюцца на якасці жыцця і на кашальку. Пра тое, як зберагчы нятаннае зараз цяпло, распавядае інжынер вытворчага аддзела УП «ЖРЭА Савецкага раёна горада Мінска» Васіліна ШУТ:**

— Самы дзейсны спосаб захаваць цяпло — гэта класічнае ўцяпленне аконных і дзвярных праёмаў. Даражэйшым варыянтам будзе замена старых драўляных вокнаў на шклопакеты. Жыхарам, чые кватэры размешчаны на першым паверсе, рэкамендавана ўцяпленне падлогі.

Пры неабходнасці сцены дамоў «апранаюцца» ў тэрмафутра. У першую чаргу гэта датычыцца тых пабудоў, дзе састаянна назіраецца высокая вільготнасць, а ў халодны час года прамярзаюць сцены. Але гэты спосаб не падыходзіць для тых будынкаў, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, помнікамі архітэктуры.

Ды і самі жыхары таксама мусяць клапаціцца аб тым, каб у іх кватэрах альбо дамах было цёпла. У шматпавярховых дамах не трэба пакідаць адчыненымі вокны і дзверы ў пад'ездах. Неабходна аператыўна паведамляць у жыллёва-эксплуатацыйную службу пра выбітае шкло ў рамах. Бо халодныя скразнякі ў пад'ездзе асабліва адчуюць тыя жыхары, чые кватэры выходзяць пераважна на лесвічную пляцоўку. Акрамя таго, мікраклімат у кватэры залежыць ад асаблівасцяў сістэмы ацяплення. Адзін пакой можа прагравацца лепш, другі — горш. Галоўнае, каб вытрымліваўся сацыяльны стандарт. Згодна з ім, тэмпература ў жылым памяшканні не павінна падаць ніжэй за 18 градусаў.

У перыяд існавання Савецкага Саюза актыўна будаваліся панельныя дамы, у якіх батарэі з трубамі ацяплення ўбудоўвалі ў вонкавыя сцены. Мабыць, для тых часоў, калі выкапнёвыя энергарэсурсы не купляліся за валюту і пра іх эканомію мала хто задумваўся, гэтая праблема не была вельмі важнай. Але цяпер падыход да яе кардынальна змяніўся. Васіліна Шут працягвае:

— Трубы ацяплення, якія знаходзяцца ў сценах, вынесці ў кватэру можна. Але каб пасля не мець праблем з законам, павінен быць складзены і зацверджаны адпаведны праект. Згодна з ім і будзе адбывацца неабходная праца. Таксама трэба пралічыць усе дадатковыя нагрузкі, якія пры гэтым абавязкова ўзнікнуць, узгадніць тып радыятара, які будзе ўсталяваны ў кватэры... Зразумела, што гэта справа не аднаго дня, таму лепш паклапаціцца аб гэтым загадзя.

Калі ж наймальнік памяшкання вырашыў самавольна мадэрнізаваць такім чынам сістэму ацяплення, то ён рызыкуе падпасці пад адміністрацыйную адказнасць. Справа ў тым, што вынас труб з'яўляецца перапланіроўкай. Таму злоўленага парушальніка чакае штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь. Канчатковая сума залежыць ад характару зробленых змяненняў. А потым перад ім адкрываюцца два шляхі. Першы — гэта проста прывесці памяшканне ў ранейшае становішча, каб не даводзіць справу да судовага пасяджэння. Другі — паспрабаваць распрацаваць праект, які ўзаконіць зробленыя змяненні. Але гэты варыянт вельмі хісткі, бо парушальнік атрымлівае прадпісанне, у якім чорным па беламу пазначаны тэрмін, да якога недахоп павінен быць выпраўлены.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ХТО АПЛАЦІЦЬ ВЫДАТКІ?

**Традыцыйна, калі значна халадае, грамадзяне, якія жывуць у дамах з цэнтралізаваным цеплазабеспячэннем, міжволі ўспамінаюць мінулы ацяпляльны сезон. І прыемна яго ўспомніць, калі батарэі былі гарачымі і пры самым непрымальным надвор'і ў пакоях было ўтульна. А калі не, лепш не ўспамінаць. І, вядома, узнікае новае пытанне: а ці будзе сёлета цёпла ў кватэры? Безумоўна, пасля падаражання камунальных паслуг людзі чакаюць ад камунальнікаў стабільнага цяпла.**

Падрыхтоўка да чарговага ацяпляльнага сезона заўсёды была на асаблівым кантролі рэвізораў.

— На жаль толькі з 2-3-га захадаў некаторыя звароты пачынаюць вырашацца, — гаворыць Вадзім Заранкін, першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. — Адказныя асобы пачынаюць выязджаць на месцы, глядзець, прымаць меры. І кантроль гэтага — вялікі кавалак нашай работы.

— Штогод, а не толькі ў кастрычніку, калі традыцыйна пачынаецца падключэнне дамоў да цяпла, вядзем маніторынг: выязджаем на месцы, арганізуем тэлефонныя «гарачыя лініі». На асаблівым кантролі цяпло ў школах, садках, — расказвае Віктар Коцікаў, начальнік упраўлення кантролю галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

— Летась у Шаркаўшчыне ўсяго за некалькі гадзін станоўча вырашылі праблемную сітуацыю з ацяпленнем у садку. Ад яго работніц паступіў сігнал, што тэмпература ў памяшканнях усяго плюс 12 градусаў. Аказалася, што новыя катлы не працавалі з-за паломкі транспарцёра падачы трэсак. У выніку работнікам, якія абслугоўвалі кацёл, усё ж прыйшлося кідаць паліва ўручную. На наступны дзень транспарцёр ужо адрамантавалі.

У кастрычніку-лістападзе будуць правярацца камунальныя прадпрыемствы ў Сенненскім і Верхнядзвінскім раёнах, дзе раней былі выяўлены недахопы ў рабоце па падрыхтоўцы да ацяпляльных сезонаў.

Кантралююцца і якасць дроў і трэсак, якія прызначаюцца для насельніцтва. Летась у трох раёнах вобласці недахопы былі выпраўлены.

— Нядаўна закончылі праверку камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Оршацеплсеткі», падчас якой былі выяўлены шматлікія парушэнні. У прыватнасці, нягледзячы на значную дзяржаўную падтрымку, фінансавы стан прадпрыемства пагаршаецца. І гэта звязана са значным перавышэннем нарматываў паліўна-энергетычных рэсурсаў. Пры гэтым не выконваюцца мерапрыемствы па энергазберажэнні. Напрыклад, яшчэ ў 2008 годзе падчас рэканструкцыі кацельні ў пасёлку Дачнае ўстанавілі два катлы, якія працуюць на мясцовых відах паліва — дровах. Замест 3 месяцаў аж 19 праводзілі рэканструкцыю, — расказвае Вячаслаў Данілаў, старшыня Аршанскага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю. — У выніку патрацілі больш за 225 мільёнаў бюджэтных сродкаў, а ніякага эфекту не атрымалі: каэфіцыент карыснага дзеяння замест запланаваных 82 працэнтаў толькі 69. Больш за тое, поўнасцю перайсці на дровы не атрымалася, бо па-ранейшаму выкарыстоўвацца газ. Пры гэтым дровы, якія нарыхтоўвае прадпрыемства, у 1,5 раза даражэй, чым нарыхтоўвае мясцовы лясгас. Зразумела, вялікія выдаткі прадпрыемства прыходзіцца кампенсаваць з бюджэту... У выніку праверкі прадпрыемству было прапанавана вярнуць у бюджэт 470 мільёнаў рублёў. Гэта ўжо зроблена. Вось такі яскравы прыклад безгаспадарнасці.

Бываюць пытанні, якія не патрабуюць вялікіх фінансавых выдаткаў, а толькі больш прафесійнага падыходу да рашэння праблемы. Напрыклад, з боку сантэхнікаў.

У Камітэце канстатуюць, што на рабоце камунальнікаў той жа Оршы, ды і ў цэлым вобласці, негатыўна адбіваецца вялікі знос цепласетак. У Оршы да «Дажынак», якія праводзілі тут некалькі гадоў таму, толькі часткова перакладалі сеткі. Астатнія часта выходзяць са строю, асабліва летам, калі вядзецца праверка іх гатоўнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ ПРА ДАПАМОГУ НА ДЗЯЦЕЙ

**Далёка не ўсе маладыя сем'і сёння ведаюць аб тым, якую матэрыяльную дапамогу ад дзяржавы яны маюць права атрымліваць пры нараджэнні дзяцей. Часта выклікана гэта занятасцю людзей: ім няма калі вывучаць шматлікія нарматыўныя дакументы. У выніку атрымліваецца, што многія застаюцца без дапамогі. Таму прапануем вам падрабязны агляд асноўных відаў дапамогі.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Віды дапамогі

Іх некалькі: у сувязі з нараджэннем дзіцяці; жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці; па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў; на дзяцей, старэйшых за 3 гады. Як правіла, усе яны назначаюцца па месцы працы (службы), вучобы (у дзённай форме атрымання адукацыі) маці дзіцяці, а калі маці не працуе і не вучыцца, то бацькі. Асобам, якія працуюць у камерцыйных арганізацыях з сярэдняй колькасцю работнікаў на каляндарны год да 15 чалавек уключна, а таксама непрацуючым асобам дапамога (пры наяўнасці права на яе) назначаецца і выплачваецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Выплачваецца дапамога за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і рэспубліканскага бюджэту. Памеры дапамогі пераразлічваюцца з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня і 1 лістапада ў сувязі з павелічэннем бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

## Неабходныя дакументы

Для таго, каб атрымаць дапамогу пры нараджэнні дзіцяці, вам трэба будзе прадаставіць пэўныя дакументы ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы жыхарства ці па месцы працы (службы), вучобы маці (бацькі) дзіцяці. Сярод іх: заява; пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу; даведка аб нараджэнні дзіцяці (арыгінал); пасведчанне аб нараджэнні, калі дзіця нарадзілася за мяжой (з завераным перакладам); пасведчанне аб нараджэнні, смерці дзяцей (прадастаўляюцца на ўсіх дзяцей у сям'і); копія рашэння суда аб скасаванні шлюбу ці пасведчанне аб скасаванні шлюбу (ці іншы дакумент, які пацвярджае катэгорыю няпоўнай сям'і); выпіска (копія) з працоўнай кніжкі бацькоў ці іншыя дакументы, якія пацвярджаюць іх занятасць; даведка аб месцы жыхарства і складзе сям'і ці копія асабовага рахунку. **Акрамя таго, абавязкова трэба памятаць, што па назначэнне дапамогі неабходна звярнуцца на працягу 6 месяцаў пасля нараджэння дзіцяці. Калі вы звяртаецеся пазней, дапамога не назначаецца і не выплачваецца. Таксама нельга забываць, што пры вызначэнні права на дапамогу не ўлічваюцца дзеці, у адносінах якіх маці пазбаўлена бацькоўскіх правоў, а таксама адабраныя дзеці і дзеці, якія нарадзіліся мёртвымі.**

**УВАГА!**

**Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці не назначаецца ў выпадку нараджэння мёртвага дзіцяці.**

## Ад нараджэння да 3 гадоў

Жанчыны, якія сталі на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, атрымліваюць дапамогу на аснове пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу, і медыцынскага заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі. Але дапамога назначаецца толькі ў тым выпадку, калі жанчына рэгулярна наведвала ўрачоў і выконвала ўсе іх прадпісанні падчас усяго тэрміну цяжарнасці. Дапамога такім жанчынам будзе складаць найбольшую велічыню пражытковага мінімуму на дату нараджэння дзіця (пакуль гэта 843 870 рублёў).

Пасля заканчэння перыяду, што засведчаны лісткам непрацаздольнасці ў сувязі з цяжарнасцю і родамі, узнікае права на дапамогу па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў. Для асоб, што не маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах ці не скарысталіся ім, падобнае права ўзнікае ў дзень нараджэння дзіцяці. Пры назначэнні дапамогі на месцы працы (службы), вучобы бацькі, ці ў органах працы, занятасці і сацыяльнай абароны ў дапаўненне да раней азначаных дакументаў трэба прадаставіць даведку аб перыядзе, за які выплачана дапамога па цяжарнасці і родах. У асобных выпадках патрабуюцца і дадатковыя дакументы (напрыклад, копія пасведчання дзіцяці-інваліда). Памер дапамогі зноў будзе складаць найбольшую велічыню пражытковага мінімуму. У палавінным памеры дапамога будзе назначана: асобам, якія выйшлі на працу на ўмовах, што прадугледжваюць іх занятасць больш за палову месячнай нормы працоўнага часу; пры афармленні дзіця ва ўстанову, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі; у перыяд працоўнага адпачынку. Выплачвацца дапамога будзе штомесяц да моманту дасягнення дзіцем 3-гадовага ўзросту.

## На дзяцей, старэйшых за 3 гады

Каб атрымліваць ад дзяржавы дапамогу на дзяцей, старэйшых за 3 гады, ужо спатрэбяцца такія дакументы: заява; пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу; пасведчанні аб нараджэнні непаўналетніх дзяцей; дакумент, які пацвярджае катэгорыю няпоўнай сям'і (пасведчанне аб скасаванні шлюбу, пасведчанне аб смерці аднаго з бацькоў і інш.); даведка аб тым, што грамадзянін з'яўляецца навучэнцам: на дзяцей старэйшых за 14 гадоў (прадастаўляецца на дату вызначэння права на дапамогу і на пачатак навучальнага года), а для тых, хто навучаецца за асабістыя сродкі, дадаткова ўказваюцца адпаведныя звесткі; даведка аб тым, што грамадзянін з'яўляецца навучэнцам ці выхаванцам і адносіцца да прыходзячага кантынгенту: на дзяцей, якія наведваюць установы адукацыі (у тым ліку дашкольныя) з кругласутачным рэжымам знаходжання дзіцяці; звесткі аб атрыманых даходах (іх адсутнасці) кожнага члена сям'і за год, які папярэднічае году звароту; выпіскі (копіі) з працоўных кніг бацькоў ці іншых дакументаў, якія пацвярджаюць іх занятасць; даведка аб месцы жыхарства і складзе сям'і ці копія асабовага рахунку. У асобных выпадках спатрэбяцца дадатковыя дакументы (напрыклад, копія пасведчання дзіцяці-інваліда).

Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, не назначаецца, калі на момант звароту па яе працаздольны бацька (у поўнай сям'і, у няпоўнай — адзін з бацькоў) не працуе і не мае іншага віду занятасці (атрыманне пенсіі, дапамогі па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, інваліда I групы, асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту). Таксама дапамога не назначаецца, калі ў годзе, што папярэднічае году звароту, працаздольны бацька не працаваў і не меў іншага віду занятасці на працягу больш чым 6 месяцаў. Права на дапамогу ўзнікае: у дзень, наступны за днём, калі дзіцяці спаўняецца 3 гады; 1 студзеня года звароту па дапамогу; у дзень працаўладкавання ці занятку іншым відам дзейнасці; у дзень, калі ў дзіцяці ўстаноўлена інваліднасць.

Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з 1 студзеня 2012 года назначаецца: у памеры 50% бюджэту пражытковага мінімуму (з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2012 года — 421 940 рублёў) у выпадку, калі сукупны даход на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 60% бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня папярэдняга года (за верасень 2011 года — 459 832 рублі); у палавінным памеры 50% бюджэту пражытковага мінімуму (з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2012 года — 210 970 рублёў) у выпадку, калі сукупны даход на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 80% бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня папярэдняга года (за верасень 2011 года — 344 874 рублі). **Варта адзначыць, што сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, дзіця, якое інфіцыравана ВІЧ, ва ўзросце да 18 гадоў, няпоўным сем'ям, у якіх маці (бацьку) устаноўлена I ці II група інваліднасці (пры ўмове, што яны не працуюць і не маюць іншага віду занятасці), а таксама сем'ям вайскоўцаў, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, дапамога на ўсіх дзяцей у сям'і назначаецца і выплачваецца незалежна ад сукупнага даходу на члена сям'і.**

На жаль, практыка паказвае, што многія сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, не ведаюць, што гэты від дапамогі назначаецца не толькі на дзіця-інваліда, але і на ўсіх дзяцей у сям'і без уліку сукупнага даходу на члена сям'і. Пры гэтым у выпадку, калі маці дзіцяці не працуе, аформіла догляд дзіцяці-інваліда з выплатай дапамогі па доглядзе за ім і пенсіі на дзіця-інваліда ва ўпраўленні сацыяльнай абароны па месцы жыхарства, рэалізаваць сваё права на дапамогу на ўсіх дзяцей у сям'і можна па месцы працы бацькі дзіцяці. Але трэба звярнуцца па дапамогу не пазней за 6 месяцаў з дня ўзнікнення права на яе (пры звароце пасля 6 месяцаў — дапамога выплачваецца з дня падачы заявы з усімі неабходнымі дакументамі).

**Аляксандр ШЫМАНСКІ,**
**начальнік аддзела сацыяльнага страхавання Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.**

### ЛІЧБЫ

***Дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці назначаецца ў дзесяціразовым памеры найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму на дату нараджэння дзіця (з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2012 года — 8 438 700 рублёў). Пры нараджэнні другога і астатніх дзяцей — дапамога будзе складаць чатырнаццаціразовы памер найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (11 814 180 рублёў).***

# ЯК НЕ «ПРАЛЯЦЕЦЬ» МІМА ГРОШАЙ?

## Гэта важна

У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, адказнасць за своечасовую выплату дапамогі і абавязак выплаты ляжыць на наймальніку. Кантралююць правільнасць выдаткоўвання сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. У тым выпадку, калі праз прадастаўленне загадзя недакладных звестак, утойванне заробку ці іншага даходу, непрадастаўленне (нясвоечасовае прадастаўленне) звестак аб надыходжанні абставін, што цягнуць спыненне выплаты дапамогі, іншых змяненнях, што ўплываюць на права атрымання дапамогі ці яе памер, і арыфметычную памылку былі выплачаны лішнія грошы, гэтыя грошы атрымальнік павінен вярнуць.

## ПРЫКЛАДЫ ПАРУШЭННЯ ЗАКАНАДАЎСТВА ПРЫ ВЫПЛАЦЕ ДАПАМОГ ПА ВІНЕ АТРЫМАЛЬНІКАЎ

***— Грамадзянка «С» па асноўным месцы працы (дзе была назначана дапамога па доглядзе дзіцяці) знаходзілася ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і адначасова працавала ў дзвюх арганізацыях па сумяшчальніцтве (у кожнай па 0,5 стаўкі). Аб працы па сумяшчальніцтве жанчына не паведаміла па месцы назначэння дапамогі, дзе яна ёй выплачвалася ў поўным памеры, а трэба было ў палавінным. У выніку былі выяўлены пераплаты дапамогі на суму 5 262 350 рублёў. Гэтыя грошы жанчына была вымушана вярнуць.***

***— Грамадзянка «Р», парушаючы працоўнае заканадаўства, працавала па дзвюх працоўных кніжках ва УП «М» і ТАА «Г». У кожнай арганізацыі яна была афармлена, як па асноўным месцы працы. Па кожным з месцаў працы яна звярнулася па назначэнне дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, а пасля спаўнення 3 гадоў — за дзіцем, старэйшым за 3 гады. Пры назначэнні дапамог жанчына не сказала, што працуе ў двух месцах і не прадаставіла звесткі аб даходах, якія яна атрымала ў кожнай арганізацыі. Жанчыне пераплацілі 22 510 000 рублёў. Гэтую суму трэба вярнуць, інакш яе будуць забіраць у судовым парадку.***

***— Грамадзянка «М» знаходзілася ў водпуску па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў і атрымлівала адпаведную дапамогу ў поўным памеры. Яна не паведаміла, што аформіла дзіця ва ўстанову дашкольнай адукацыі. Пераплата — 1 350 410 рублёў. Жанчына вярнула ўсе грошы.***

Ну і ну!

## МАЛАДЗЁНЫ Ў ЧОРНЫХ МАСКАХ УЧЫНІЛІ БОЙКУ СА СТУДЭНТАМІ

**У сталіцы ў мікрараёне Дражня пятнаццаць падлеткаў у чорных масках арганізавалі бойку з навучэнцамі каледжа.**

— Старшакласнікам мясцовых вучэбных устаноў падалося, што іх недастаткова «паважаюць» у «іх» жа раёне студэнты аднаго з каледжаў. Тым больш што аднаго з актывістаў кампаніі апошнія нядаўна пакрыўдзілі. На «разборкі» маладзёны сабраліся зранку — у лесапаркавай зоне, — сказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Каб і сябе не выдаць, і праціўніка напужаць, кожны сам вырабіў сабе маску з прарэзамі для вачэй — хто з шапкі, хто з майкі.

Падчас размовы адзін з навучэнцаў адказаў «не па паняццях», што стала нагодай для першага і наступных удараў. Бойка працягвалася некалькі хвілін: убачыўшы першую патрульную машыну, задзіры кінуліся наўцёк. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі ўсю кампанію цягам гадзіны. Свой учынак маладзёны патлумачылі як жаданнем адпомсціць крыўдзіцелю іх таварыша, так і «навесці парадак» у Дражні. У адносінах да падазроных заведзена крымінальная справа. Зараз яны адпушчаны пад падпіску аб нявыездзе. Праводзіцца расследаванне. Што датычыцца студэнтаў, дык некалькі з іх звярнуліся ў медустановы з сінякамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# МАСТАКІ НА ВЯСКОВАЙ ВУЛІЦЫ


Галіна Адаменка і яе партрэт.

**СВК «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна запрасіў беларускіх мастакоў увасобіць сельскія пейзажы і вяскоўцаў на сваіх палотнах, каб потым адкрыць уласную карцінную галерэю. Такі мастацкі пленэр адбыўся ўпершыню.**

## «ДЗЕДАЎСКАЯ» НАТУРА

Раней я такое бачыла толькі ў кіно: ідылічная сельская карцінка, дарога пятляе паміж хат па пагорках, дрэвы ў прыгожым восеньскім убранні, і ўсюды — на полі, у садах і абапал вуліцы мастакі з мальбертамі малююць з натуры.

Праўда, абавязковая ў такіх сюжэтах белая блуза ў вольным мастацкім стылі, падпяразаная поясам, удзельнікам мастацкага пленэру ў калгасе «Радзіма» зусім не падышла б. Яны больш падобныя на аматараў рыбалкі ці збірання грыбоў, якія трапілі са сваім хобі ў суровыя ўмовы надвор’я: гумавыя боты, цёплыя курткі, надзейныя непрамакальныя штаны, насунутыя на вочы шапкі — у гэтых людзях не адразу пазнаеш вядомых беларускіх мастакоў. Першая дэкада кастрычніка ў Бялыніцкім раёне не самая халодная і часам досыць сонечная, але ветраная і вільготная. Але творчаму настрою мастакоў надвор'е — зусім не перашкода.

Вёска Гняздзін — невялікае паселішча паблізу аграгарадка Вішоў, цэнтра калгаса. Тут жыве крыху больш за дзясятак жыхароў, пераважна старых. Гняздзін знакаміты ў акрузе тым, што яго наведаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, а цяпер вось краявіды і далягляды гэтай вёсачкі ўвекавечаны на карцінах мастакоў.

— У нас у Беларусі ўсюды цікава, — кажа сталічны мастак Уладзімір Уродніч. —У гэтай вёсцы жывуць людзі ўзросту маіх бацькоў, якіх ужо няма са мной. Мне прыемна настальгіраваць, калі я бачу вулачкі, падобныя на тыя, дзе я гадаваўся. Тут мала аўтамабіляў, затое шмат яблыкаў!

Міма праходзіць жанчына з двума поўнымі вёдрамі спелых яблыкаўпуцінак. А на мальберце Уладзіміра — эцюд з вясковай вуліцай, дрэвамі абапал, жоўтым лісцем. Удалечыні няясныя сілуэты калег-мастакоў і таксама гасцей-журналістаў. А вось, падаецца, і я сама: чорны плашч, джынсы, блакнот у руках.

— Гэта знікне, — Уладзімір махае рукой навокал. — Уся гэтая сучасная інфраструктура не мае цяпла, паверце. Толькі той, хто адчувае ўвосень пах прэлай травы і лісця, яшчэ мае пад сабой зямлю — тую, дзедаўскую. А цывілізаваныя аграгарадкі — гэта ўжо іншае. Мастакі цягнуцца да старызны і традыцый. У гэтай архаіцы заключана наша добрая памяць.

## УВЕКАВЕЧАНЫЯ НЕБА І ДУША

Уладзімір Уродніч, які шмат гадоў працаваў у Міністэрстве культуры, расказаў, што з'яўляецца аматарам ідэі стварэння сельскіх мастацкіх галерэй: «Гэта будзе цікава: падобнае мы рабілі ў 1980-х гадах, але потым усё знікла. Цяпер вось упершыню ў Беларусі кіраўнік гаспадаркі запрасіў прафесійных мастакоў увасобіць тутэйшае жыццё».

Мастацкі пленэр прысвечаны 140-годдзю Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Таму ўдзельнікі будуць таксама працаваць і ў вёсцы Крынкі: там захаваліся камяні падмурку дваранскай сядзібы, дзе нарадзіўся вядомы жывапісец, і бэз, пасаджаны яшчэ пры яго жыцці.

А ўсё пачалося з магілёўскага мастака Паўла Дзмітрыядзі, які родам з вёскі Гняздзін і сябруе з сельскай гаспадаркай «Радзіма». У яго і нарадзілася ідэя сабраць на пленэр сваіх сяброў — выхаванцаў выкладчыка Мінскага мастацкага вучылішча Алега Луцэвіча. Такім сяброўскім колам мастакі і сабраліся на бялыніцкай натуры.

— Мы малюем тут душу сваю, — кажа Павел. — Рэалізм паказвае тое, што зрабіў Бог, а мы гэтаму радуемся і перадаём сваю радасць іншым.

